УДК 327.33+327.33(476)

Л. У. Ляховіч

# СССР — ФРАНЦЫЯ: СТРАТЫ І НАБЫТКІ 80-Х

Позняй восенню 1991 г. у Латчы, асабістым маёнтку Прэзідэнта Францыі, адбылася апошняя сустрэча М. Гарбачова і Ф. Мітэрана. Мімаходзь асветленая ў друку, яна была адной з самых унутрана складаных за пасляваенны перыяд у двухбаковых зносінах. «Я спадзяюся і надалей працаваць з Гарбачовым» [1], — сцвярджаў Мітэран, пастаўлены перад цяжкай дылемай: супрацоўнічаць з Гарбачовым ці з Ельцыным? Сам Гарбачоў усведамляў хісткасць свайго палітычнага становішча і мусіў выпрацаваць больш-менш трывалыя перспектывы, між тым як Савецкі Саюз дажываў тыдні... Для Францыі і СССР гэта сустрэча была, па сутнасці, вынікам усяго апошняга савецкага дзесяцігоддзя.

80-я гады — гэта перыяд кантрастаў, крызісаў, змены стэрэатыпаў і ломкі ў міжнародных зносінах. У гэтым дзесяцігоддзі ўвасобіліся практычна ўсе праблемы, якія хвалявалі сусветнае супольніцтва ў пасляваенны час. У гэтай сувязі вывучэнне і аналіз гэтага перыяду неабходны і дзеля разумення сённяшніх рэалій.

Першая палова 80-х гг. — найбольш цяжкі перыяд для сусветнага супольніцтва, падзеленага на два непрымірымыя лагеры — сацыялістычны і капіталістычны на чале з СССР і ЗША. Эпоха разрадкі скончылася, напружанасць у зносінах паміж Захадам і ўсходам «дасягнула свайго параксізму» [2]. Вайна ў Афганістане, апазіцыйны рух у Польшчы, ваенныя акцыі Ізраіля ў Лівane, Фалклендскі канфлікт, падзеі ў Чадзе і на Грэнадзе, у Нікарагуа і Сальвадоры — вось яскравыя ўвасабленні барацьбы звышдзяржаў за сферы ўплыву. Гэта быў час, калі СССР быў названы «імперыяй зла», разгортваліся рэйганаўскія «зорныя войны», у Еўропе размяшчаліся амерыканскія ракеты, а бясконцыя перамовы паміж СССР і ЗША аб абмежаванні ўзбраенняў заставаліся, па сутнасці, безвыніковымі.

Небывалага ўзроўню дасягнула ідэалагічнае супрацьстаянне. Імперыялістычныя агрэсары штодзённа клеймаваліся ў савецкім друку, апісваўся ўсё больш глыбокі крызіс усіх бакоў заходняга грамадства, у якім абвінавачвалася як капіталістычная сістэма, так і лідэры краін. Традыцыйнымі ў савецкім друку сталі рубрыкі «Два міра — два вобразы жыцця» і «Іх норавы». Савецкаму чытачу настойліва ўнушалася вера ў паспяховасць і эфектыўнасць сацыялізму, СССР прадстаўляўся як краіна ўсеагульнага дабрабыту і самай развітой дэмакратыі. У заходніх краінах, у сваю чаргу, разгортвалася антысавецкая істэрыя, ставіліся пы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

танні правоў чалавека ў СССР і праследавання дысідэнтаў. Узрослыя ваенныя расходы знясільвалі рэсурсы савецкай эканомікі, якая ўжо ўвайшла ў крызісны стан, між тым як «антынародны, накіраваны супраць правоў працоўных» неакансерватыўны курс ЗША і Англіі даваў станоўчы эканамічны вынік.

Становішча Францыі ў дадзенай сітуацыі вельмі складанае. Яна не можа губляць Савецкі Саюз як эканамічнага партнёра, «дазволіць сабе выступаць з пагрозамі, якія раздаюцца з Вашынгтона» [3]. Такая пазіцыя выклікала негатыўную рэакцыю з боку ЗША, якія аказвалі моцны эканамічны ціск на Францыю і краіны ЕЭС. Ва ўмовах эканамічных складанасцяў пачатку 80-х гг. Вашынгтон пагражае адмовіць Францыі ў пазыцы на 4 млрд. долараў [4], у сваю чаргу Францыя адмаўляецца прымаць удзел у нарадзе «вялікай сямёркі» ў Вільямсбергу, не згаджаючыся з эканамічым ціскам ЗША на сацыялістычныя краіны [5]. ЗША і Францыя маюць рознагалоссі па пытаннях перамоў з СССР аб ядзернай зброі, палітыкі ЗША ў Лацінскай Амерыцы і на Блізкім Усходзе, адносін да СССР і краін Варшаўскага дагавору. «Доўгі шлях, на якім багата шматлікіх перашкод», — так ацэньвае парыжская газета «Эко» зносіны Францыі і ЗША [6].

Яшчэ больш складанымі былі адносіны Францыі і СССР. Увод савецкіх войск у Афганістан выклікаў адмоўную рэакцыю з боку Францыі, якая расцаніла гэта як шкоду разрадцы і парушэнне правоў чалавека [7, с. 175]. Негатыўна адрэагавала Францыя на палітыку СССР у адносінах да польскай «Салідарнасці» і ваеннай дапамогі СССР краінам, якія сталі на шлях сацыялістычнага развіцця. У французскай прэсе неаднаразова закраналіся праблемы правоў чалавека ў СССР і праследавання дысідэнтаў: высылка акадэміка Сахарава ў Горкі [8], арышты дзеячаў групы, якая выступала супраць выкарыстання псіхіятрыі ў палітычных мэтах [9], рэпрэсіі супраць эстонскіх дысідэнтаў, якія склалі адкрыты ліст да 40-годдзя пакта Молатава-Рыбентропа [10] і г. д. Але прычыны супярэчнасцяў паміж СССР і Францыяй былі больш глыбокімі.

Ужо з канца 70-х гг. пачалася паступовая пераарыентацыя знешняй палітыкі Францыі ў бок атлантызму. Прычын было некалькі: расчараванне ў савецкай канцэпцыі разрадкі з яе ідэалагізаванымі дагматычнымі поглядамі на грамадска-гістарычнае развіццё; падзеі ў «трэцім свеце», дзе ішло хуткае распаўсюджанне савецкага ўплыву, найбольш яскрава ўвасобленае ў афганскай вайне; нарастанне ваеннага патэнцыялу СССР і адчуванне ваеннай пагрозы з боку Савецкага Саюза. Усё гэта прывяло французскіх палітыкаў (акрамя камуністаў) да перакanання, што СССР імкнецца да падрыву сістэмы Захаду [11, с. 36—38]. Вынікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтага ў знешняй палітыцы Францыі быў канчатковы паварот да атлантызму, а характэрнай з'явай грамадскага жыцця Францыі і першай паловы 80-х гг. было рэзка адмоўнае стаўленне да СССР і яго палітыкі, аб чым у 1984 г. заявіла 74% французаў [11, с. 89]. Пазіцыю Ф. Мітэрана можна было адзначыць так: Францыя выступае за кантакты з СССР як фактар «еўрапейскай раўнавагі», але цвердае «не» Маскве, калі гэта патрэбна. Францыя — гэта заходні свет, а атлантычны саюз, сцвярджаў К. Шэйсон, «адзначае агульную абарону ідэй гуманізму і цывілізацыі» [7, с. 220].

Практычна гэта азначала падтрымку размяшчэння ў Еўропе амерыканскіх ракет, «даўзбраенне Еўропы» і стварэнне «еўрапейскага ядзернага шчыта» пры моцным ваенным супрацоўніцтве з ФРГ [12, с. 193—194], узмацненне ЕЭС і павышэнне ролі Францыі ў ерапейскіх справах.

Будучы ядзернай дзяржавай, Францыя выступала супраць уліку і магчымага скарачэння сваіх ядзерных узбраенняў у агульным стратэгічным балансе. Гэта тэндэнцыя была ўстойлівай на працягу ўсіх 80-х гг. і найбольш яскрава сфарміравана ў 1987 г. Ж. Шыракам: «Вопыт паказаў, што звычайных узбраенняў ніколі не было дастаткова, каб прадухіліць вайну. Ці не абавязаны мы наяўнасці ядзернага стрымання тым, што наш кантынент ужо больш 40 гадоў жыве ў міры?.. Абавязак кіраўніка заключаецца ў тым, каб бачыць рэальнасць такой, як яна ёсць» [13]. У дадзенай сітуацыі зразумела, што Францыя аб'ектыўна ішла ў фарватэры знешняй палітыкі ЗША, што, натуральна, выклікала негатыўную рэакцыю СССР. Так, ацэньваючы праамерыканскую пазіцыю Францыі па блізкаўсходняму пытанню ў 1982 г., савецкая прэса адзначае «вялікае недаўменне, што Парыж... не адмежаваўся ад планаў амерыканскай адміністрацыі», яе цікавіць «ці разумеюць у Парыжы, да якіх наступстваў можа прывесці падатлівасць у адносінах да планаў Вашынгтона і... як яна ударыць па прэстыжу французскай палітыкі?» [14].

У самой Францыі ў 1983 г. разгарнулася антысавецкая кампанія. У красавіку французскія ўлады патрабавалі выезду з Францыі групы супрацоўнікаў савецкага пасольства, гандлёвага прадстаўніцтва, аддзялення ТАСС, генконсульства СССР у Марсэлі. Прычына — шпіянаж і раскраданне дзяржаўных і ваенна-тэхнічных тайн; будынак прадстаўніцтва Аэрафлоту ў Марсэлі быў абстраляны [15]. Выступаючы па тэлебачанню ў чэрвені 1983 г., Ф. Мітэран адзначыў, што «крызіс заходняга свету дасягнуў такога размаху, якога не ведалі з часоў крызісу 1929 і 1930 гг.» [16].

На працягу першай паловы 80-х гг. не ўдалося зрабіць істотных крокаў да палітычнага збліжэння, а ў 1981 г. назіраўся «амаль поўны дэмантаж» у двухбаковых зносінах. [17]. У час візіту Ф. Мітэрана ў СССР у чэрвені 1984 г. зноў выказваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзаемныя пажаданні паляпшэння міжнародных зносін, але сцвярджалася ўсё ж тое, што «СССР і Францыю многае раздзяляе: адрозненні ў грамадска-эканамічнай пабудове, ідэалогіі, разыходжанні па шэрагу немалаважных міжнародных пытанняў», хаця ў цэлым баланс зносін быў прызнаны канструктыўным [18].

У адрозненне ад палітычных і эканамічных кантактаў, дынамічна развіваліся гуманітарна-культурныя і навуковыя сувязі. Прычына не толькі ў іх устойлівасці, але і ў асаблівасцях зносін СССР і Францыі. Для СССР, маючага даўнія рэвалюцыйныя традыцыі і моцную кампартыю, якая поўнасцю падтрымлівала палітыку СССР [19], буржуазная Францыя была своеасаблівым мастом у заходні свет, а для Францыі, якая імкнулася да еўрапейскай гегемоніі, СССР быў самым надзейным нейтралізатарам ЗША. Невыпадкова таму Францыя стала першай з вядучых капіталістычных краін, якую наведаў М. С. Гарбачоў у кастрычніку 1985 г. Асабліва адзначаліся дасягненні ў навуковым супрацоўніцтве (сумеснае асваенне космасу), культурным абмене [20]; падпісана пагадненне аб эканамічным супрацоўніцтве на 1986—1990 гг. На сумеснай прэс-канферэнцыі Ф. Мітэранам было выказана «пачуццё таго, што абодва бакі пайшлі наперад па шляху азнаямлення з узаемнымі думкамі» [21].

Новыя знешнепалітычныя арыенціры Савецкага Саюза былі, аднак, стрымана ацэнены Францыяй, якая ў найменшай ступені знаходзілася пад уплывам «эфекту Гарбачова». Апошні характарызаваўся «яркай асобай новага стылю, якая імкнецца звярнуцца да народаў, мінуючы ўрады і... іграць на даверы Захаду». Гарбачоў «ажыццяўляе геапалітычныя мэты СССР», таму Паўночнаатлантычны блок павінен быць пільным, каб яго не захапілі знянацку [22]. Тым не менш у французскай знешняй палітыцы з'яўляецца новы тэрмін — еўраатлантызм, і ў 1985 г. Францыя прапануе заходнееўрапейскім краінам перадавы навуковы праект «Эўрыка», мэта якога — забеспячэнне тэхнічнай незалежнасці ад ЗША і Японіі. Усяго прапанаваліся 24 навейшыя навуковыя праекты, прычым не выключалася іх ваеннае выкарыстанне [23].

Нягледзячы на спробы збліжэння, назіраліся стрыманасць і нават падазронасць у двухбаковых зносінах. Так, нібыта за шпіянаж і крадзёж сакрэтаў ракеты «Арыян» былі высланы з Францыі тры савецкія супрацоўнікі, а грамадзянка СССР Л. П. Варыгіна (Вердзье) і яе муж-француз былі абвінавачаны ў шпіянажы [24]. Але ў тым жа 1987 г. у Францыю прыехала група савецкіх палітычных дзеячаў — «Ініцыятыва-87». Зблізіліся погляды абодвух краін па пытанні аб скарачэнні звычайных узбраенняў у Еўропе, у Парыжы адмовіліся ад ідэі валодання хімічнай зброяй, паступова знікалі ідэалагічныя штампы ў рабоце ЮНЕСКА і г. д. [25].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля выбрання на другі тэрмін Ф. Мітэрана ў еўрапейскай палітыцы Францыі адбылася змена арыенціраў. Дэстабілізацыя на кантыненце, нежаданая для Францыі перспектыва аб'яднання Германіі і пачатак скарачэння звычайных узбраенняў падштурхнулі Прэзідэнта Францыі зрабіць стаўку на СССР як на асноўнага саюзніка ў стварэнні «новай архітэктуры Еўропы» [25]. У 1989 г. больш за 300 прадстаўнікоў савецкіх палітыкаў і грамадскасці наведалі Францыю ў рамках акцыі «Дыялог-89» [26]. У атмасферы аптымізму і ўздыму адзначалася 200-годдзе Вялікай французскай рэвалюцыі і візіты М. С. Гарбачова ў Францыю ў 1989 і 1990 гг.

Нарэшце, пасля «фактычна дзесяці згубленых гадоў» [27] адбыўся, здавалася, трыумф узаемаразумення і новага палітычнага мыслення. У час візіту 1989 г. падпісаны шэраг пагадненняў, якія ахоплівалі практычна ўсе бакі жыцця — ад гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва да абмену ў галіне архіваў [28]. У 1990 г. быў падпісаны Дагавор аб згодзе і супрацоўніцтве паміж СССР і Францыяй, непасрэдна паводле канцэпцыі «агульнаеўрапейскага дома», і Пратакол аб згодзе, паводле якога Францыя аказвала СССР крэдытную дапамогу ў памеры 5 млрд. франкаў, а таксама шматлікія пагадненні ў эканамічнай, навукова-тэхнічнай, культурнай і гуманітарнай сферах [29]. Але з прычыны распаду СССР гэтыя планы фактычна не рэалізаваліся. Невыпадкова таму рэальна мыслячыя палітыкі Францыі ўспрынялі вынікі візіту 1990 г. хутчэй як палітычны жэст. Францыя вельмі асцярожна сустрэла развал Савецкага Саюза, свайго даўняга і вельмі важнага партнёра, яна не першай прызнала суверэнітэт былых рэспублік СССР і ацаніла СНД як ненадзейнае ўтварэнне.

Разглядаючы гандлёва-эканамічныя сувязі першай паловы 80-х гг., трэба ўлічваць як складанасці ў двухбаковых зносінах эканамічныя санкцыі ЗША і КОКОМ па абмежаванню гандлю з сацыялістычнымі краінамі, так і асаблівасці эканомікі абодвух краін. Да пачатку 80-х гг. сітуацыя ў савецка-французскім гандлі была вельмі спрыяльнай: у 1970—1980 гг. аб'ём гандлю павялічыўся больш як у 9 разоў, і ў 1980 г. Францыя займала трэцяе месца сярод развітых капіталістычных краін у гандлі з СССР, уступаючы ФРГ і Фінляндыі [12, с. 148]. Аднак ужо ў 1982 г. Францыя займае пятае месца, а гандлёвы абарот паміж ёй і СССР складае 5 млрд. руб., што на 700 тыс. менш, чым у 1981 г. [29, с. 225]. У 1983 г. канстатуецца далейшае замаруджванне гандлёвых зносін. Так, калі ў 1984 г. тавараабарот складаў 4224 млрд. руб., то ў 1985 — 3779, у 1986 — 2641, у 1987 — 2608 [30]. Моцны ўдар гандлю нанесла падзенне цэн на энерганосьбіты ў 1985 г. Некаторае ажыўленне гандлю (калі Францыя заняла чацвёртае месца) назіраецца ў 1988 г. з прычыны паляпшэння двухбаковых зносін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На структуры экспарту-імпарту можна яскрава ўбачыць асаблівасці эканомікі СССР, якая ў значнай ступені трымалася на экспарце сыравіны, і зразумець, чаму Францыя, якая пакутвала ад энергетычнага крызісу, лічыла Савецкі Саюз такім жаданым партнёрам. Так, на 1988 г. аснову савецкага экспарту складалі энерганосьбіты (84%), у тым ліку прыродны газ (20%), нафта (50%), нафтапрадукты (14%), а таксама бавоўна, цэлюлоза, піламатэрыялы ды інш.; машыны і абсталяванне (станкі, металургічнае і прэсавае абсталяванне, легкавыя і грузавыя аўтамабілі, трактары, гадзіннікі і г. д.) — толькі 3,2% [31]. Негатыўна адбіваліся на гандлі нізкая канкурэнтаздольнасць савецкіх тавараў, антыдэмпінгавае заканадаўства Францыі, тарыфныя абмежаванні, санкцыі ў рамках КОКОМ ды інш.

У студзені 1982 г. быў падпісаны кантракт на пастаўку з СССР на працягу 25 гадоў 8 млрд. м$^3$ прыроднага газу. Узамен Францыя выконвала заказы на сучаснае абсталяванне сістэмы тэлекамунікацыі (фірма «ТОМСАН»), кампрэсарныя і ахаладжальныя ўстаноўкі (фірма «КРЭЗО-ЛУАР»), газавыя турбіны (фірма «ІСПАНА-СЮІЗА). Для Францыі, якая залежыла ад савецкіх энерганосьбітаў, пагадненне па газаправоду мела і вялікае сацыяльнае значэнне, таму што забяспечыла занятасць 12 тыс. чалавек на працягу года [29, с. 224]. У 1985 г. знешнегандлёвае аб'яднанне «Машынаімпарт» падпісала кантракт з французскімі фірмамі «ЛУРГІ-ФРАНС», «ТЭКНІП», «ЛІТВІН» на пастаўку абсталявання па перапрацоўцы нафты і газу [32]. Вясной 1985 г. металургічная кампанія «ЮЗІНОР» (50% французскай вытворчасці сталі) падпісала самае вялікае за апошнія 20 гадоў пагадненне з СССР аб пастаўцы сталі прыкладна на 4 млрд. франкаў. Фірма «ВАЛУРЭК» выконвала савецкія заказы на трубы, рэалізаваўся доўгатэрміновы кантракт з «РЭНО» на распрацоўку і вытворчасць новай мадэлі «Масквіча», быў заключаны кантракт з «ІНТЭРАГРА» — адной з буйнейшых фірм-экспарцёраў сельгаспрадукцыі [33]. У фірмы «ЕТПМ» было закуплена абсталяванне для вытворчасці буравых установак, а ў фірмы «СПЕЙШЫМ» — для вытворчасці метыяніну, пастаўлялася абсталяванне для вытворчасці сродкаў хімічнай аховы раслін, электраізаляцыйных лакаў, палімераў [34]. У 1989 г. былі заключаны кантракты на пастаўку ў СССР абсталявання па вытворчасці плёнкі з тэрмазварачным слоем і мадэрнізацыі чатырох швейных фабрык, заключаны пагадненні з фірмамі «ПЕШЫНЭ» (тара і ўпакоўка), «РЭМА» (упакоўка для прадуктаў), «АРЭАЛЬ» (парфумерыя ў аэразолях), «АЛЬКАТЭЛЬ» (сістэмы сувязі) ды інш. [35]. У сваю чаргу СССР паставіў Францыі абсталяванне для домен, металаканструкцыі для будаўніцтва тунэля пад Ла-Маншам.

Было заключана 28 пагадненняў аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў, але на той час новыя формы супрацоўніцтва не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрымалі належнага развіцця, а ўсталяванне прамых сувязяў фірм не давала значнага выніку [31, с. 3]. Гэта адбывалася з прычыны нізкай канкурэнтаздольнасці савецкіх тавараў, крызіснага стану эканомікі СССР, адсутнасці дзейсных гаспадарчых і прававых механізмаў рэгулявання эканомікі.

Такім чынам, Францыя, маючы ядзерную зброю, на працягу 80-х гг. праводзіла прагматычную палітыку лавіравання паміж ЗША і СССР, прычым ідэалагічныя і прапагандыцскія прыёмы часу перабудовы не рабілі на яе значнага ўплыву. СССР цаніў Францыю як апору на Захадзе, але не жадаў адмаўляцца ад сваіх ідэалагічных і геапалітычных прынцыпаў. Толькі ў канцы 80-х гг. зносіны набылі сапраўдную трываласць, але, па іроніі гісторыі, гэта не мела працягу. У цэлым адносіны Францыі і СССР стваралі моцны стрыжань стабільнасці ў зносінах Усход—Захад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Правда. 1991. 1 нояб.
2. Historie de l`Union Sovietique. Paris. 1990. P. 500, 505.
3. Правда. 1981. 23 февр.
4. Правда. 1983. 20 апр.
5. Правда. 1983. 28 апр.
6. Советская Белоруссия. 1981. 23 окт.
7. *Зуева К. П.* Советско-французские отношения и разрядка международной напряженности (1958—1986). М., 1987.
8. Le Monde. 1981. 1 janv.
9. Le Monde. 1981. 10 janv.
10. Le Monde. 1981. 12 janv.
11. *Нарочницкая Е. А.* Франция в блоковой системе Европы. 1960—1980-е гг. М., 1993.
12. *Челышев Н. А.* Советско-французские отношения и проблема европейской безопасности. Середина 60-х — 80-х гг. М., 1990.
13. Правда. 1987. 15 мая.
14. Правда. 1982. 11 июля.
15. Правда. 1983. 13 апр.
16. Правда. 1983. 10 июня.
17. Международная жизнь. 1996. № 2.
18. Визит в Советский Союз Президента Французской республики Франсуа Миттерана 20—23.06.1984. М., 1984. С. 15.
19. L`Humanite. 1983. 19 janv.
20. Визит Генерального секретаря ЦК КПСС М. С. Горбачева во Францию 2—5.10.1985: Документы и материалы. М., 1985. С. 33—35.
21. Правда. 1985. 5 окт.
22. *Жантон Ж.* НАТО и общественное мнение. М., 1990. С. 3—5.

23. *Манжола В. А.* Ядерное оружие Франции и вопросы европейской безопасности. Киев, 1989. С. 131, 152.

24. Правда. 1985. 5 окт.

25. Новое время. 1989. № 43.

26. За рубежом. 1989. № 43.

27. Новое время. 1989. № 48.

28. Визит М. С. Горбачева во Францию 4—5.07.1989 года. Париж, 6.07.1989 года — Страсбург: Документы и материалы. М., 1989. С. 92—96.

29. Визит М. С. Горбачева во Францию 28—29 октября 1990 года: Документы и материалы. М., 1990. С. 32, 44, 60.

30. *Laviche M.* A. La cooperation economique franco-sovietiqu-ne: bilans et possibilities. Paris. 28, 29, 30 janv. 1983: Документы Белорускогo общества дружбы и культурной связи с зарубежными странами.

31. Отношения СССР-Франции на современном этапе: Документы Белорусского общества дружбы и культурной связи с зарубежными странами.

32. Правда. 1985. 27 апр.

33. Правда. 1985. 30 сент.

34. Международная жизнь. 1982. № 10.

35. Правда. 1987. 9 окт.

*SUMMARY*

*The article is devoted to the analysis of extremely difficult situation in international relations of the last soviet ten-years. The ideological and political causes of the French-Soviet strained relations in the early eighties, the influence of Gorbachov's phenomena on them and the situation on the eve of and during the disintegration of USSR are analysed here. Special attention is paid to their trade-economical co-operation the development of which took place in a close connection with the general international situation.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 942.084

*І. Р. Чыкалава*

# ГЕНДЭР І ДЗЕЙНАСЦЬ КАНСЕРВАТЫЎНЫХ І ЛЕЙБАРЫСЦКІХ УРАДАЎ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ (1970—1990 гг.)

Кансерватыўная партыя Вялікабрытаніі на хвалі жаночага руху ў прынятым напярэдадні парламенцкіх выбараў 1974 г. праграмным Маніфесце зрабіла першую спробу звярнуцца непасрэдна да жанчын. Кансерватары заяўлялі аб падтрымцы заканадаўства, знішчыўшага дыскрымінацыю жанчын па шэрагу пытанняў, абяцалі распрацаваць новае, каб скасаваць дыскрымінацыю